# СЛОВА

## ЗНАЧЭННЕ СЛОВА

**139.** Разгледзьце схемы і скажыце, што мае кожнае слова.

| | | |
|---|---|---|
|  | будынак для жылля | дом |
| **прадмет** | **значэнне** | **слова** |

| | | |
|---|---|---|
|  | рухацца ў паветры пры дапамозе крылаў | ляцець |
| **дзеянне** | **значэнне** | **слова** |

| | | |
|---|---|---|
|  | светла-сіні, колеру яснага, чыстага неба | блакітны |
| **прымета** | **значэнне** | **слова** |

?! У якім слоўніку можна даведацца пра значэнне слова?



Правообладатель Национальный институт образования

Кожнае слова мае **лексічнае значэнне.** Пра лексічнае значэнне слова можна даведацца ў **тлумачальным слоўніку.**

**140.** Прачытайце словы. Паспрабуйце растлумачыць іх значэнне.

Асілак, здарожыцца, гасцінны.

Параўнайце сваё тлумачэнне з тым, што даецца ў тлумачальным слоўніку.

Дапоўніце сказы патрэбнымі словамі і запішыце.

1. Чалавек незвычайнай мужнасці і адвагі — гэта ... . 2. ... гаспадыня любіць прымаць і частаваць гасцей. 3. Дзядуля ... і вырашыў крыху адпачыць.

**141.** Прачытайце верш. Ці згодны вы з аўтарам? Якія бываюць словы? Прывядзіце свае прыклады такіх слоў.

Слоў самых розных у мове багата.
Родныя словы — **мама** і **тата.**
Мудрыя словы — **розум,** вучэнне.
Смачныя словы — **торт** і пячэнне.
Цікавыя словы — **выдумка, казка.**
Ветлыя словы — бывай, калі ласка.
Прыемныя словы — **сюрпрыз, сувенір.**
Лепшыя словы — Радзіма і **мір.**



Правообладатель Национальный институт образования

Значэнне якіх выдзеленых слоў раскрываецца ніжэй?

1. Кандытарскі выраб са здобнага цеста з крэмам, фруктамі. 2. Жанчына ў адносінах да сваіх дзяцей. 3. Твор пра выдуманыя падзеі, часта з удзелам чарадзейнай сілы. 4. Мужчына ў адносінах да сваіх дзяцей. 5. Памятны падарунак. 6. Нечаканы падарунак. 7. Згода, адсутнасць варожасці, сварак. 8. Вымысел, фантазія. 9. Здольнасць мысліць, разумець.

Запішыце чатыры словы на выбар разам з іх значэннем.

Узор. *Казка — твор пра выдуманыя падзеі, часта з удзелам чарадзейнай сілы.*

**142.** Прачытайце і запомніце прыказкі. Чаму так гавораць? З якімі словамі трэба звяртацца да людзей, каб не пакрыўдзіць іх?

Слова даражэйшае за золата.
Слова не верабей: выпусціш — не зловіш.
Слова не пірог: не выкінеш за парог.

Запішыце першую прыказку па памяці. Падкрэсліце ў ёй слова, значэнне якога раскрываецца ніжэй.

Адзінка мовы, якая служыць для называння асобнага паняцця.



Правообладатель Национальный институт образования

**143.** Знайдзіце ў кожнай групе слоў лішняе. Запішыце астатнія словы. Што аб'ядноўвае запісаныя словы кожнай групы?

1. Дзядуля, бабуля, тата, мама, кот.
2. Васілёк, рамонак, ружа, пчала, дзьмухавец.
3. Кот, карова, мядзведзь, мёд, воўк.
4. Малаток, дрэва, сякера, піла, рубанак.
5. Аўтобус, трамвай, машына, цягнік, дарога.

## Адназначныя і мнагазначныя словы

**144.** Разгледзьце малюнкі і скажыце, колькі значэнняў маюць запісаныя словы. Патлумачце значэнне гэтых слоў.




Словы, якія маюць адно значэнне, называюцца **адназначнымі**. Словы, якія маюць некалькі значэнняў, называюцца **мнагазначнымі**.



Правообладатель Национальный институт образования

**145.** Прачытайце словы. Знайдзіце іх значэнне ў тлумачальным слоўніку.

Ручнік, серві́з, ваза, маска, ружа, клетка.



Спішыце. Падкрэсліце адназначныя словы. Прыдумайце і запішыце два сказы з адназначнымі словамі.

**146.** Прачытайце словы. Патлумачце іх значэнне. У якой групе запісаны адназначныя словы, а ў якой — мнагазначныя? Дапоўніце кожную групу слоў. Выкарыстайце словы для даведкі.

1. Афіша, балерына, музыкант, скрыпка, ..., ... .
2. Іголка, клас, зорка, пад’езд, ..., ... .

Словы для даведкі: *дошка, хлопчык, нос, дырыжор.*

Да якога слоўніка можна звярнуцца пры выкананні задання?



Правообладатель Национальный институт образования

**147.** Значэнне якіх слоў раскрываецца ніжэй? Назавіце сярод гэтых слоў мнагазначныя.

1. Гульня ў адказы на пытанні па адной тэме.
2. Лёгкая ежа паміж абедам і вячэрай. Перадвячэрні час.
3. Малое дзіця.
4. Рознакаляровая дуга на небе, якая ўтвараецца ад праламлення сонечных прамянёў у кроплях дажджу.
5. Парадкавы лік прадмета. Асобны пакой у гасцініцы. Частка тэатральнага паказу, якая выконваецца асобна.
6. Песня, якую спяваюць над калыскай.

Словы для даведкі: *віктарына, немаўля́, падвячорак, нумар, вясёлка, калыханка.*

Выпішыце адназначныя словы разам з іх значэннем.

Узор. *Віктарына — гульня ў адказы на пытанні па адной тэме.*

**148.** Прачытайце. Адкажыце на пытанне верша. Спішыце.



Вожык пад ёлкай
скакаў з Вавёркай.
Уся ў іголках
была Вавёрка.




Правообладатель Национальный институт образования

Адкуль жа іголкі:
з Вожыка
ці з ёлкі?
*А. Зэкаў.*



Падкрэсліце мнагазначнае слова, якое сустрэлася ў вершы. Якія значэнні яно мае? У якім значэнні гэта слова ўжыта ў вершы?

## Прамое і пераноснае значэнне слова

**149.** Прачытайце сказы. У якім значэнні ўжыты ў іх выдзеленыя словы?

| | |
|---|---|
| Бабуля **выглянула** ў акно. | паказалася |
| Сонейка **выглянула** з-за воблака. | паглядзела |
| Тата **напаіў** дачушку малаком. | паліў |
| Дождж **напаіў** дрэвы і траву. | даў папіць |

Спішыце сказы, у якіх прыродныя з'явы апісваюцца вобразна. Дзякуючы якім словам ствараецца вобразнае апісанне?

**во́блака**

Словы могуць ужывацца ў прамым і пераносным значэнні. **Прамое** значэнне слова з'яўляецца пачатковым, асноўным. **Пераноснае** значэнне ўзнікае звычайна пры пераносе назвы з аднаго прадмета на другі на аснове іх падабенства.


Правообладатель Национальный институт образования